№ 22(145)

ПАХОДНЯ

Грамадска-палітычная газета

Снежань 2012 г.

ЧАМУ МОЛАДЗЬ НЕ ХОЧА ЗАСТАВАЦЦА ПРАЦАВАЦЬ У ВЁСЦЫ?

Днямі адбылась калегія калегія камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванню Магілёўскага аблвыканкама, якая разгледзела толькі адно пытанне, а менавіта – ход выканання рашэння Магілёўскага аблвыканкама “Аб абласной праграме “Кадры 2011-2015 года” і рашэння аблвыканкама “Аб комплексе мерапрыемстваў па закрапленню кадраў у сельскагаспадарчых арганізацыях вобласці на 2011-2015 гады”.



Па выніках паседжання калегіі работа упраўленняў сельскай гаспадаркі і харчавання райвыканкамаў у рэалізацыі кадравай палітыкі прызнана недастатковай. Абласныя чыноўнікі таксама паведамілі, што прыняты шэраг мер, накіраваных на паляпшэнне працы з кадрамі ўсіх узроўняў. Былі вызначаны таксама асноўныя чыннікі незамацавання маладых спецыялістаў у сельскагаспадарчых арганізацыях:

- нізкі ўзровень сярэдней заработнай платы ў разрэзе сярэдней па гаспадарцы;
- выдзяленне жылля ў неадпаведным стане;
- непрадастаўленне выхадных дзён;
- адсутнасць прамой зацікаўленасці ў маладым спецыялісце з боку кіраўнікоў гаспадарак.

Безумоўна, можна пагадзіцца з усімі гэтымі высновамі чыноўнікаў ад сельскай гаспадаркі Магілёўскай вобласці, аднак нельга не адзначыць, што і тут яны не абыйшліся без долі хітрасці – ну для каго ў нашай краіне з'яўляецца сакрэтам, што “нізкі ўзровень сярэдней заработнай платы ў разрэзе сярэдняй па гаспадарцы” не

(Пачатак. Заканч. на стар. 2)

БЯЛЫНІЦКІЯ КАМУНАЛЬНІКІ ПАДПІШУЦЦА НА ДЗЯРЖАЎНЫЯ ГАЗЕТЫ І ЗДАДУЦЬ МАКУЛАТУРУ

Кожны супрацоўнік УКП “Бялыніцкі жылкамгас” павінен у абавязковым парадку падпісацца хоць бы на адну дзяржаўную газету. Адпаведнае заданне давялі да працаўнікоў жылкамгасу ідэолагі прадпрыемства.

Па словах супрацоўнікаў жылкамгаса, акрамя падпіскі на дзяржаўную прэсу, кожны работнік прадпрыемства павінен яшчэ і ў абавязковым парадку здаць пэўную колькасць макулатуры, бо прадпрыемству даведзены вялікі план па нарыхтоўцы другаснай сыравіны.

Будзем спадзявацца, што, дзякуючы ініцыятыве ідэолагаў і такому вось комплекснаму падыходу, план па здачы макулатуры супрацоўнікі УКП “Бялыніцкі жылкамгас” выканаюць без усялякіх праблем.

Сяргей Семяновіч

ОСТАНУТСЯ ТОЛЬКО ПРОДОВОЛЬСТВЕННЫЕ РЫНКИ?

Обсудить будущее рынков Могилевщины пригласило жителей области управление торговли облисполкома. Людей просят высказаться о возможности функционирования только продовольственных рынков. На вещевых рынках предлагается организовать торговлю только вещами, бывшими в употреблении, продукцией ремесленников и производителей республики.

В Могилевской области насчитывается 59 рынков, в том числе 2 - продовольственных, 9 - вещевых, 47 - смешанных, 1 - зооботанический. Число торговых мест и торговых объектов на рынках области составляет 10 994, из них число торговых мест и торговых объектов, на которых фактически осуществлялась розничная торговля – 7 800.

ЧАМУ МОЛАДЗЬ НЕ ХОЧА ЗАСТАВАЦЦА ПРАЦАВАЦЬ У ВЁСЦЫ?

(Заканч. Пачатак на стар. 1)

толькі ў маладых спецыялістаў, а наогул у абсалютнай большасці працаўнікоў вёскі. Працаўнікоў вёскі, нягледзячы на ўсе громкія словы з боку чыноўнікаў ад улады пра росквіт сельскай гаспадаркі ў нашай краіне, па-ранейшаму абдзіраюць, як ліпку, тыя ж перапрацоўшчыкі, ды і бюракраты таксама ў баку не застаюцца. Калі хтосьці хоча са мной не пагадзіцца, параўнайце,калі ласка, якія заробкі ў працаўнікоў сельскай гаспадаркі і колькі атрымліваюць за сваю працу супрацоўнікі перапрацоўчай галіны і чыноўнікі ад улады. Прычым, думаю, для большасці жыхароў нашага сельскагаспадарчага Бялыніцкага раёна, ды і ўсёй краіны, не з'яўляецца сакрэтам, што праца ў сельскагаспадарчай вытворчасці даволі цяжкая, таму чаргі на працаўладкаванне нават у лепшыя гаспадаркі не назіраецца. Між тым, ужо больш за васямнаццаць гадоў нашы працавітыя ідэолагі распавядаюць байкі пра тое, як добра жывецца селяніну ў "квітнеючай" Беларусі…

Таксама ні для каго ў нашай краіне не з'яўляецца сакрэтам, што нашы паважаныя чыноўнікі прызвычаіліс "пiлiць бабло", якое ідзе на падтрымку сельскай гаспадаркі, а іншыя пытанні іх не вельмі хвалююць. Таму і той факт, што цэны на сельгаспрадукцыю па дарозе ад поля да прылаўка ўзрастаюць у разы, камусьці вельмі выгодны. Не сакрэт, што ў шматлікіх беларускіх перапрацоўчых і тарговых прадпрыемствах працуе вельмі шмат дзетак нашых уладных чыноўнікаў, а ім жа трэба добра харчавацца, апранацца і адпачываць…

І моладзь усё гэта выдатна бачыць і разумее. Ну скажыце, навошта маладому чалавеку ісці працаваць у сельскую гаспадарку літаральна за капейкі, не маючы часцяком гарантаваных выхадных, добрых умоў для працы і адпачынку, калі можна з'ехаць у горад і жыць нашмат прасцей і цікавей? Больш за тое, многія бацькі вясковых хлопцаў і дзяўчат самі



праўдамі і няпраўдамі выпраўляюць туды сваіх дзяцей, кажучы: " Мы ўсё жыццё гарбелі ў сельскай гаспадарцы і нічога не нажылі, акрамя хваробаў, няхай хоць нашы дзеці пажывуць, як людзі".

І, ці можна асуджаць за гэта бацькоў, калі ведаеш, што жыве сапраўды беларуская вёска зусім не так, як пішацца ў ружовых справаздачах чыноўнікаў ад сельскай гаспадаркі і ідэалогіі…

Магчыма, таму і з кожным годам працаваць у сельскай гаспадарцы застаецца ўсё менш людзей. Так, у Бялыніцкім раёне, які лічыцца сельскагаспадарчым, у сельскагаспадарчай галіне ў мінулым 2011 годзе працавала ўсяго 1613 чалавек пры агульнай колькасці насельніцтва ў 21 тысячу…

Яшчэ раз хачу падкрэсліць: навошта маладому чалавеку ісці працаваць у сельскую гаспадарку, калі сярэдні заробак за 9 месяцаў 2012 года ў працаўнікоў сельскагаспадарчай галіны Магілёўскай вобласці склаў толькі 2378,8 млн. рублёў, пры тым, што намінальная налічаная сярэднемесячная заработная плата па Магілёўскай вобласці за адпаведны перыяд склала 3223,5 млн. рублёў. Як кажа народная мударасць, рыба шукае дзе глыбей, а чалавек – дзе лепш. І зразумела, што маладыя людзі не пойдуць працаваць у вёску толькі дзеля таго, каб паслухаць на "адзіных днях інфармавання насельніцтва" пра тое, як добра яны жывуць у "квінеючай Беларусі" і як клапоцяцца пра сельскую гаспадарку чыноўнікі ад улады. Дзіўна толькі, што, пры такім добрым жыцці працаўнікоў сельскай гаспадаркі, іх колькасць пастаянна зніжаецца, а колькасць "працалюбівых" бюракратаў расце шалёнымі тэмпамі, пра што ўжо загаварыў нават кіраўнік краіны Аляксандр Лукашэнка.

Ды і, агітуючы ісці працаваць у сельгаспрадпрыемствы моладзь, штосьці нашы кіраўнікі і чыноўнікі сваіх дзетак на працу ў сельскую гаспадарку не адпраўляюць, усё больш прасоўваюць бліжэй да сябе…

Але чаму тут здзіўляцца, яны-то самі рэальны стан спраў у сельскай гаспадарцы нашай краіны ведаюць выдатна.

Іван Барысаў

ВОРУЮТ ВСЁ

7 декабря Следственным комитетом возбуждено у/д по ст. 205 ч. 2 УК (Кража) в отношении неработающего жителя г. Быхова 1981 г.р. (ранее судимого за кражу), который 1 декабря около 23-00 по пер. Музыкальному из гаража местного жителя 1965 г.р. похитил мотоцикл, шлифовальную машинку. Задержан в порядке ст. 108 УПК. Часть похищенного изъята, сообщает интернет-сайт УВД Могилёвского облисполкома.

НАЧАЛЬСТВО ТОЖЕ ВОРУЕТ

В народе отмечено: чем богаче индивид, тем более алчным и скаредным он может стать. Такова человеческая природа — страсть к деньгам делает характер мелочным и толкает на преступления… Не так давно судом Могилевского района за кражу был приговорен к штрафу в сумме 10 млн. рублей бывший заместитель директора ЗАО «Агрокомбинат «Заря». Один из первых лиц известного в республике предприятия на пару с рядовым работником был уличен в хищении остатков сырья, предназначенного для производства комбикормов. Схема была довольно проста.

Для этого аппаратчик комбикормового производства недосыпал сырье в бункера на комбикормовом заводе, припрятывая мешки с излишками в цеху. Затем товар втайне от остальных работников предприимчивым «замом» вывозился на служебном автомобиле к себе по месту жительства. В итоге за период с третьей декады октября по третью декаду декабря 2011 года было похищено 75 кг сухого цельного молока, 150 кг двух видов кормовой добавки и 74 кг белкового сырья «Шрот подсолнечный» на общую сумму 4 764 240 рублей. На похищенное сырье преступниками были найдены и покупатели, готовые выложить по 100 000 рублей за мешок. Ущерб, причиненный предприятию, был возмещен виновными лицами в полном объеме.

Как пояснил в ходе предварительного расследования теперь уже бывший заместитель директора ЗАО «Агрокомбинат «Заря», если в бункер надо было засыпать 10 мешков сухого молока, то аппаратчик комбикормового производства засыпал 9 мешков. То же самое было и с премиксом. Кроме того, со слов аппаратчика комбикормового производства, на заводе не проводилась инвентаризация в связи с непрерывным производством комбикорма.

Соучастник преступления, аппаратчик комбикормового производства, также понес заслуженное наказание.

Вл. Лось, пом. прокурора Могилевского р-на, “ВМ”

ПОЖАЛЕЛИ ДЕНЕГ НА ЗИМНЮЮ РЕЗИНУ

За совершение кражи в Могилеве были задержаны двое братьев. 28-летний могилевчанин и его 26-летний родственник из Белынич похитили с автомобиля «Тойота» четыре колеса.

Кровные братья, будучи автовладельцами, хотели «переобуть» свои машины, однако денег на зимнюю резину пожалели. Проехавшись по ночному городу, на переулке Урожайном они увидели «Тойоту» с подходящими колесами. Братьев, разукомплектовывающих чужое авто, заметил проезжавший мимо таксист. Сознательный гражданин, заподозрив неладное, сообщил об увиденном в милицию, и к месту происшествия оперативно прибыли два наряда милиции. Возле «пострадавшей» машины уже никого не было. Служебно-розыскная собака взяла след, и как раз в том направлении, куда она повела сотрудников милиции, раздался звук заводящегося мотора. Милиционеры перехватили отъезжающий автомобиль и задержали злоумышленников.



В отношении них Могилевским районным отделом Следственного комитета возбуждено уголовное дело по ст. «Кража», сообщает интернет-сайт УВД Могилёвского облисполкома. Подельникам грозит до четырех лет лишения свободы.

У ШКЛОВЕ БЫЛЫХ ЗНЯВОЛЕНЫХ ПРЫМУСІЛІ ПРЫБІРАЦЬ ПАРК

Напрыканцы лістапада ў Шклоўскім раённым аддзеле ўнутраных спраў у межах акцыі “Крок насустрач”, накіраванай на сацыялізацыю раней судзімых жыхароў раёна, прайшоў “Кірмаш вакансій”. У мерапрыемстве прынялі начальнік РАУС Аляксандр Піменаў, пракурор Шклоўскага раёна Дзмітрый Лянчэўскі, намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама Мікалай Яроміч, а таксама жыхары Шклоўскага раёна, якія знаходзяцца на ўліку ў крымінальна-выканаўчай інспекцыі.

Падчас сустрэчы міліцэйскія і райвыканкамаўскія чыноўнікі распавялі пра маючыеся ў раёне працоўныя вакансіі, пасля для ўсіх прысутных на мерапрыемстве быў прадэманстраваны фільм “Свет у канцы тунэля”.

Ну а пасля завяршэнняараднай часткі мерапрыемства ўсіх раней судзімых асоб, якія прысутнічалі на сустрэчы, адправілі на “дабрачынныя” работы – прыбіраць тэрыторыю гарадскога парку. Зразумела, што згоды на ўдзел у “дабрачынных” работах ніхто ў былых зняволеных не пытаўся. Яны проста былі пастаўлены перад фактам.

Як паведамляе раённая газета “Ударны фронт”, падобныя акцыі ў раённым аддзеле ўнутраных спраў райвыканкама праводзяцца штомесячна, райаддзелам прынятае рашэнне працягнуць працу ў дадзеным накірунку і ў будучым 2013 годзе.

На сённяшні дзень колькасць непрацуючых былых зняволеных у Шклоўскім раёне складае 39 чалавек, у гэтым годзе было працаўладкавана 22 чалавекі. Усяго на ўліку ў крымінальна-выканаўчай інспекцыі Шклоўскага РАУС знаходзіцца 361 грамадзян, маючых судзімасць, а таксама асуджаных да пакаранняў, не звязаных з ізаляцыяй ад грамадства.

Вікторыя Бялова

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

СЕРГЕЙ АНТОНОВ: У МЕНЯ ЕСТЬ МЕЧТА



Сергей Антонов

Так уж вышло, что жителям Беларуси, находящейся на перекрестке Запада и Востока, всегда приходилось о чем-то мечтать. Только в новейшей истории мы мечтали об окончании разрухи, посеянной гражданской войной, о конце репрессий устроенных кремлевским горцем, о конце Великой Отечественной и, наконец, о свержении ига большевизма. Какие-то надежды и чаяния сбылись, но это не сделало белорусов свободными. Можно даже сказать, что проблем прибавилось.

Детям и внукам большевиков, пользуясь природным пацифизмом белорусов, удалось удержаться у власти, вновь подмять под себя страну, которая по сути дела, никогда и не вставала с колен.

Людей, которые не читают книг, следует опасаться. А ведь подавляющее большинство белорусских наследников Полиграфа Шарикова ни к чему, кроме переписки Энгельса с Каутским, не прикасалось. Отсюда – их ненависть к интеллигентам-очкарикам, в подробностях знающих историю своей страны и говорящих на родном языке. Отсюда их желание подменить все истинно белорусское бутафорией с попугайски-крикливых биллбордов «Я люблю Беларусь!», соломенных чучел крестьян с нарисованными улыбками, да деревянных пародий на аистов и зубров.

Псевдопатриотам удалось выстроить свою идеологию околпачивания, создать машину по уничтожению национальных ценностей и оплатить народными деньгами услуги пропагандистов, ее обслуживающих.

Ярким и печальным примером того, что из этого получилось, являюсь я сам – белорус, который к своим сорока годам так и не научился думать по-белорусски.

Сначала русскоязычная школа, затем - такой же институт, срочная служба в Москве. В начале 90-х появилась робкая надежда – в районной газете, штатные сотрудники были обязаны писать на белорусском. Писал. Не выпуская из рук толстенный словарь под редакцией Кондрата Крапивы. Но учиться родному языку долго не довелось: грянули выборы-референдумы и, за считанные годы, все вернулось на круги своя.

Два государственных языка, среди которых русский пользовался безусловным приоритетом, руководитель страны, не умеющий и не желающий говорить на белорусском, стали камнями преткновения на пути к моей личной белорусизации.

Нет ничего удивительного в том, что свои первые романы я начал писать на русском языке. Не скажу, что не пытался бороться с этим, но быстро понял: чтобы писать на белорусском, следует на нем же думать, в противном случае все литературные потуги будут не более чем техническим переводом.

Сегодня белорусский язык из уст русскоязычного автора будет звучать достаточно фальшиво и надежды на изменения у меня нет. Остается лишь мечта, что сын, которому сейчас двадцать лет, еще не до конца искалечен механизмом уничтожения национального самосознания. О том, что земля обетованная, до которой мне, увы, уже не суждено добраться, все же существует. О том, что белорусы «смогут вырубить камень надежды из горы отчаяния», стать не аморфной массой без роду-племени, а самостоятельной национальной единицей. О том, что, в конце концов, мои внуки будут говорить на белорусском языке и гордиться этим.

ЛЕОНОВ: ФЕРМЕРАМ НЕ НАДО МЕШАТЬ, НУЖНО СОЗДАВАТЬ ИМ УСЛОВИЯ

Прежде, чем начинать реформу села, должна быть признана политическая и экономическая свобода.

Такое мнение высказал экс-министр сельского хозяйства Беларуси Василий Леонов в рамках программы ОГП-ТВ из нового цикла «Беларусь после Лукашенко».

«Сначала, до реформы села, должна быть признана политическая и экономическая свобода. Если одного нет, то другого не бывает, – считает Василий Леонов. – Должны быть признаны равноценными все формы хозяйствования: личное подсобное хозяйство, фермерство, крупные акционерные хозяйства и др. Когда мы дадим людям управление собственностью и предусмотрим, чтобы туда не зашел случайный народ, фермеры сами во всем прекрасно разберутся. Надо будет только консультировать и учить их.

Людям не надо мешать, нужно создавать им условия. И если не мешать, а помогать фермерам, то мы сможем увидеть у нас на рынках не польские, а белорусские яблоки, которые ничуть не хуже по качеству.

К чести наших фермеров скажу – в Беларуси есть почти все те сорта, которые есть в Польше и Германии, а также прекрасные свои белорусские сорта, более устойчивые к болезням.

А вот почему на рынках продаются яблоки не белорусские, тут надо подумать. Это уже другая сторона – работа так называемых сетей. Есть еще и третья – кому принадлежат рынки, и кто там хозяйничает».

Ucpb.org

АБ ЖАРТАЎНІКАХ АБО ФОКУСНІКАХ З МІНІСТЭРСТВА ЖКГ

10 лістапада 2009 года на паседжанні прэзідыума Савета міністраў Рэспублікі Беларусь тагачасны міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Уладзімір Белахвостаў інфармаваў удзельнікаў паседжання аб тым, што да канца 2009 года Міністэрства ЖКГ завершыць распрацоўку і прадставіць ва ўрад краіны канцэпцыю новай праграмы “Чыстая вада” на 2011-2015 гады. Гэтая праграма будзе патрабаваць фінансаванне ў аб’ёме каля 2 трлн. рублёў, заявіў прэзідыуму У.Белахвостаў.



Прайшоў час, і на чарговым паседжанні прэзідыума 9 лютага 2010 года тагачасны міністр дакладаў аб завяршэнні Міністэрствам ЖКГ працы па падрыхтоўцы канцэпцыі дзяржаўнай праграмы “Чыстая вада” на 2011-2015 гады. Аб’ём фінансавання, па словах Белахвостава, складзе 4 трлн. рублёў.

Усяго толькі за тры месяцы апетыты міністэрства ўзраслі ажно ў два разы, але ўдзельнікі паседжання чамусці на гэта ніякім чынам не адрэагавалі.

Што тычыцца выканання аналагічнай праграмы на 2006-2010 гады, міністр паведаміў тады, што за чатыры гады было ўведзена ў эксплуатацыю 243 аб’екты і асвоена 660 млрд. рублёў. На пачатак 2010 года, па словах міністра, цэнтралізаваным водазабеспячэннем ахоплена 84% насельніцтва краіны, або 8 млн. чалавек. Збудаваннямі апрацоўкі вады забяспечана 76% сістэмы пітнога забеспячэння. У адпаведнасці з праграмай падцверджана фінансаванне 78 аб’ектаў водазабеспячэння і на 2010 год.

Але ў выніку, нягледзечы на ўкладзеныя сродкі, якасць пітной вады ў шматлікіх рэгіёнах краіны за гэты перыяд толькі пагоршылася.

Крыху больш чым праз два гады, ужо новы міністр ЖКГ Андрэй Шорэц на прамой лініі ў “Народнай газеце”, якая праходзіла 15 чэрвеня 2012 года, заявіў, што ў рамках праграмы “Чыстая вада” ў 2013 годзе горад Мінск цалкам пяройдзе на падземныя крыніцы водазабеспячэння.

Гэта дазволіць зняць існуючыя праблемы з вадой у шэрагу мікрараёнаў Фрунзенскага раёна, у Малінаўцы.

На зыходзе ўжо 2012 год, а работы на некаторых аб’ектах водазабеспячэння горада, як, напрыклад, будаўніцтва водазабора “Вязынка”, яшчэ і не распачыналіся.

А працэсамі фінансавання і выкарыстання дзяржаўных сродкаў па набыццю абсталявання для станцый абезжалезвання вады на іншыя водазаборы Мінска ўжо зацікавіліся ў Генеральнай пракуратуры і Камітэце дзяржкантролю...

І тут зноўку бачна рука Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

На пачатку 2011 года праз умяшальніцтва чыноўнікаў Міністэрства ЖКГ і упраўлення ЖКГ Мінскага гарвыканкама было прыпынена набыццё абсталявання для водазабораў па коштах 2010 года, а надалей з-за адсутнасці абсталявання — замарожана будаўніцтва аб’ектаў.

Зараз жа, пасля фінансавага крызісу, кошты на тое ж самае абсталяванне ўзраслі ў разы. У выніку, для завяршэння будаўніцтва патрабуецца дадатковае фінансаванне — каля дзвюх дзесяткаў мільярдаў рублёў. А пры далейшым захаванні сітуацыі нявызначанасці з закупкай абсталявання, патрэбы ў памерах дадатковага фінансавання будуць толькі ўзрастаць.

Відаць і чарговую праграму “Чыстая вада” чакае лёс папярэдняй. Хутчэй за ўсё, запланаваныя і выдзеленыя фінансавыя сродкі будуць зноўку патрачаны, а праграма будзе зноўку правалена.

Перспектыва ж ўжывання чыстай артэзіянскай вады для шматлікіх жыхароў Мінска і іншых населеных пунктаў адсоўваецца на тэрмін у некалькі год.

Дык для каго і для чаго ў Міністэрстве ЖКГ кожны год распрацоўваюцца адна за адной разнастайныя канцэпцыі і праграмы развіцця і рэфармавання ЖКГ, праграмы, скіраваныя на павышэнне ўзроўню якасці камунальных паслугаў, аказваемых насельніцтву Беларусі?

Для каго яны пішуцца, калі за апошняе дзесяцігоддзе ні водная з іх не была выканана?

А можа варта ўжо нарэшце падрыхтаваць праграму па ліквідацыі Міністэрства ЖКГ, скарачэнню разнастайных аддзелаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі ў гарадскіх, раённых і абласных выканаўчых камітэтах?

І бездакорна яе выканаць да канца 2012 года.


Рыгор Кастусёў

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

ДЕНЬГИ НА ПОДДЕРЖАНИЕ ШТАНОВ ПРАВИТЕЛЬСТВО ОПЯТЬ ВОЗЬМЕТ ИЗ НАШИХ КАРМАНОВ

Теперь под видом оплаты избыточного потребления электричества.

В конце ноября появилась официальная информация, что в Беларуси в ближайшее время планируется ввести предельные объемы потребления электроэнергии, которая оплачивается по льготному тарифу. Соответствующие документы уже подготовлены, о чем сообщил министр энергетики Александр Озерец.



Понятно, что вписываться в лимиты смогут только сидящие в темноте. Не для того ведь их вводят, чтобы все вписывались, правда? То есть остальные сразу начнут платить за электричество гораздо больше.

Вообще, тарифы на электроэнергию в современном мире в обязательном порядке зависят от времени суток потребления. В пиковые часы тарифы выше, но ночью, в период спада потребления, тарифы во многих странах равны 0. Это стимулирует потребителей к переносу части энергозатратных работ – стирку, электросушку, мойку посуды в посудомоечных машинах и т.п. – на ночное время. А также зарядку всевозможных аккумуляторов. Таким образом снижается общая нагрузка на энергосистему страны и экономятся весьма значительные ресурсы.

Как это все работает на уровне национальной экономики, подробно рассказал М. Афанасьев в своей большой экспертной статье о белорусской энергетике. Там же он объясняет, что наши тарифы – без учета времени потребления – родом еще из советской системы. Расчеты среднего потребления тоже не менялись с тех времен, что приводит, помимо прочего, к абсолютному несоответствию современным требованиям обеспечения электроэнергией жителей новостроек.

Кроме того, если уровень цены на потребляемую населением электроэнергию в Беларуси сопоставим с ценами в западных странах, например, Финляндии (если говорить о доле, которую составляют затраты на оплату электроэнергии в общей сумме доходов), так вот если цены сопоставимы, то качество – нет. Оно не отвечает современным требованиям. Скачки напряжения в сети иногда вырубают даже ко всему привычное отечественное оборудование, что уж говорить про европейское! Современные электроплиты немецких марок отключаются по нескольку раз за время приготовления одного ужина. Это мы еще не говорим про практику наших работников энергосистем отключать электричество на пару-тройку часов ночью без предупреждения, ну, как бы, никто ж все равно не пользуется. А то, что бесперебойник у компьютера орет на весь многоквартирный дом, так «а что такое бесперебойник и с чем его едят?», правда?

В общем, вместо совершенствования системы тарифов, оптимизации энергосистемы и повышения качества собственной работы министр энергетики собирается просто взять недостающие деньги из наших карманов. И почему это меня не удивляет?

Анна Красулина, ОГП

КАДРАВЫЯ ЗМЕНЫ



Начальнікам аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб райвыканкама прызначана Наталля Сіманава, паведамляе інтэрнэт-сайт Бялыніцкага райвыканкама.

Наталля Леанідаўна нарадзілася ў Бялынічах, скончыла Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А. Куляшова па спецыяльнасці “гісторыя”. Працавала на адказных пасадах у Клімавіцкім і Бялыніцкім раёнах. Ну і, што не менж важна, з’яўляецца жонкай начальніка Бялыніцкага РАУС, палкоўніка міліцыі Юрыя Сіманава.


Цікава толькі, куды ж зараз бялынічанам звяртацца, калі яны захочуць паскардзіцца на дзеянні супрацоўнікаў міліцыі…

ЭКСПЕРТ: В САМОМ ХУДШЕМ ВАРИАНТЕ КУРС БЕЛОРУССКОГО РУБЛЯ НА КОНЕЦ 2013 ГОДА МОЖЕТ БЫТЬ BR15,5-16 ТЫСЯЧ

Такое мнение в своей публикации в еженедельнике “Обозреватель” высказал руководитель научно-исследовательского центра Мизеса Ярослав Романчук.

Как полагает эксперт, 2013 год станет крайне сложным для белорусского правительства. Так, в будущем году он ожидает падения товарного экспорта. Если по итогам 2012 года этот показатель прогнозируется на уровне 42-45 млрд. долларов, то в 2013 “будет достижением, если мы выйдем на 37-40 млрд. долларов”.

“Беларусь в 2013 г. будет устойчиво находиться в зоне дефицита торгового баланса, - пишет Ярослав Романчук. - Это значит, что будет расти давление на платежный баланс, который тоже с высокой степенью вероятности уйдет в минус. Если правительство не договорится с внешними кредиторами (в первую очередь, Россией и МВФ), если не будут проданы иностранцам активы на 3-5 млрд. долларов, нас определенно ждет девальвация”.



Глубина возможной девальвации, по оценке эксперта, “будет зависеть от готовности Нацбанка тратить золотовалютные резервы и от объемов свеженапечатанных денег. В самом худшем варианте курс белорусского рубля на конец 2013 г. может быть 15,5–16 тыс. за 1 доллар”.

Нацбанку и Совмину по силам не допустить такого обвала, полагает Романчук.

“Для этого распорядителям чужого (политикам и чиновникам) нужно, наконец, раз и навсегда прогнать от себя мысль о том, что богатство и благополучие Беларуси можно построить на нефтехимических схемах и эксплуатации интеграционной тематики, - пишет эксперт. - Нет ничего страшного в том, что экспорт в следующем году “просядет”. Даже не так страшно то, что белорусский рубль подешевеет под воздействием нового баланса торговых и финансовых потоков.

Страшно то, что Совмин/Нацбанк встречают 2013 г. в полностью разобранном виде. Они не верят в тот бюджет, который приняли на 2013 год. Они не верят в четвертую пятилетку, которую сами же предложили Лукашенко. Они не верят и боятся самих себя и того факта, что они оказались в плохое время в плохом месте”.

В ОЖИДАНИИ ЛУКАШЕНКО КОРОВАМ КРАСЯТ КОПЫТА, А У ОХОТНИКОВ ЗАБИРАЮТ РУЖЬЯ

Сюжет гоголевского “Ревизора” кажется детской сказкой по сравнению с тем, как готовятся к визиту Лукашенко в белорусских городах и селах.

После задержания журналиста “Народных навін Віцебска” Сержука Серабро, фотографировавшего укладку асфальта перед визитом Лукашенко, мы озадачились: что же хотели скрыть от народа витебские чиновники?

По традиции к приезду президента в нашей стране аврально укладывают асфальт, спешно красят фасады домов и заборы, по трассе белят деревья и приводят в порядок поля. Об этом знают все!

Порой чиновники на местах в ожидании Лукашенко проявляют необычайную изобретательность.

Вот, например, в августе 2009-го глава государства посетил свинокомплекс в деревне Остров Ляховичского района. За две недели до визита милиционеры забрали ружья у местных охотников, писала тогда “Комсомольская правда в Белоруссии”. Еще у несколько десятков жителей деревень, расположенных рядом со свинокомплексом, опломбировали сейфы, в которых хранятся ружья. Никаких бумаг при этом сотрудники органов не выдавали. “Это нарушение прав человека! И охотника!” - возмущались люди.

А в июле этого года в Витебске перед открытием “Славянского базара” к приезду Лукашенко дворники мыли улицу! Как сообщала “Народная воля”, площадка перед облисполкомом была тщательно вымыта. И это несмотря на то, что синоптики вечером обещали дождь.

В сентябре в Новогрудке работницы коммунальной службы, готовясь к визиту главы государства, вырывали траву, выросшую между плитками.

Летом прошлого года в ожидании главы государства наводили марафет в Глубоком. По информации “Еврорадио”, перед его визитом около комбикормового завода вспахали целину, которая десятилетиями лежала нетронутой. В центральный универсам завезли столько товара, сколько этот магазин не видел за все время своего существования. Не повезло жителям центральной улицы Ленина: в частном секторе были срезаны все вишни, выступавшие из-за

(Начало. Оконч. на стр. 8)

В ОЖИДАНИИ ЛУКАШЕНКО КОРОВАМ КРАСЯТ КОПЫТА, А У ОХОТНИКОВ ЗАБИРАЮТ РУЖЬЯ

(Оконч. Начало на стр. 7)



забора, причем вместе с неубранными ягодами.

Но это еще цветочки! Вы знаете, что к приезду Лукашенко оживают даже поселки в чернобыльской зоне. Как писала "Комсомолка", в городском поселке Комарин заборы и фасады зданий красили не маляры, а юристы!

Во дворах люди обсуждали предстоящий визит президента:

— Надо, чтоб почаще приезжал! Только к его встрече поселок ожил. А уедет, опять все станет и замерзнет!

А перед приездом в Ивацевичский район в 2011-ом, по рассказам местных жителей "Радыё Свабода", даже отстреливали голубей. Очевидно, местная вертикаль благоразумно предположила, что голубь — непредсказуемая птица.

Но всех переплюнул Чериковский район. В апреле 2010-го к приезду Лукашенко в одном из сел коровам покрасили копыта и помыли рога шампунем. По крайней мере, об этом сообщал украинский портал "Цензор. Нет".

Готовились к визиту президента и Жировичи. Но вот незадача – он взял и не приехал. Потом местные жители на форумах рассыпались в благодарностях: "Дорогой Александр Григорьевич, собирайтесь к нам чаще, пожалуйста. К вашему приезду асфальт становится ровнее, а заборы — новее".

В ожидании его визита в городах останавливаются трамваи, людям запрещено не только выглядывать в окна, но и даже подходить к ним, а на встречи на предприятиях с простым народом идеологи выбирают преданных власти представителей, которые не задают неудобных вопросов. Разговоры Лукашенко с народом по душам вдохновляют тех, кто видит его только по телевизору, разве что на анекдоты.

Вроде этого.

Приезжает Лукашенко в один колхоз (на завод, фабрику). Спрашивает крестьян:

— Ну, как жизнь?

Молчание.

— Как дела в хозяйстве?

Молчание.

— Как социальное обеспечение?

Молчание.

Тут председатель колхоза подходит и тихонько говорит:

— Аляксандр Рыгоравич, у нас народ простой, так шо вы з ними подоступнее гаварыце, пажалуста…

Лукашенко:

— Здарова, мужыки!

Мужики:

— Здравствуй, барин…

Ольга Слуцкая, "Салідарнасць"

МОГИЛЕВСКАЯ МИЛИЦИЯ СПАСЛА ДЕНЬГИ ДОЛЬЩИКОВ

Управлением по борьбе с экономическими преступлениями УВД Могилевского облисполкома предотвращено нанесение могилевским дольщикам ущерба в особо крупном размере.

Согласно данным борцов в экономической преступностью, в ходе проведения проверочных мероприятий по расходованию денежных средств, направленных на государственную поддержку граждан при строительстве жилья, установлен факт неоднократного нарушения сроков строительства со стороны ООО «Стройинвест» при строительстве жилого дома в Быхове.

На подобные долгострои не раз обращал внимание президент и велел принять к ним самые жесткие меры, чтобы защитить белорусских граждан. По данным правоохранительных органов, сроки строительства дома в Быхове по разным причинам много раз переносилось, а средства граждан просто тратились на никчемную текущую деятельность. Получалось, как и на многих белорусских стройках парадоксальная ситуация: дольщики платят и платят деньги, а дом все не строится или строится с таким темпами, что дожить до окончания строительства многим просто не по силам.

В Быхове в ситуацию вмешались правоохранительные органы в результате чего, КУПСП «Укапстрой» перезаключило договор на строительство дома с СРУП «Могилевский ДСК». По данным УБЭП УВД Могилевского облисполкома, это привело к уменьшению стоимости строительства, чем предотвращен ущерб интересам застройщиков на сумму более 700 миллионов рублей.

Александр Надишин, "Ежедневник"

Анекдот дня

- Работа у нас ответственная, а зарплата смешная…

- Ладно, тогда работать я буду так, что ухохочетесь.

ПАХОДНЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

Грамадска-палітычная газета. Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна

Адрас рэдакцыі: Бялыніцкі раён, в. В.Машчаніца, вул. Савецкая, д. 4. Тэл. 8 (02232) 37-365. Выдавец Вырвіч Барыс Іванавіч. Наклад 299 асобнікаў. Надрукавана на ўласным абсталяванні. Падпісана ў друк 12.12. 2012 г. у 19-00.